ПОЛЬСКІ
ІНСТЫТУТ
Мінск

# 2013

ПРАГРАМА
МЕРАПРЫЕМСТВАЎ
КАСТРЫЧНІК
ЛІСТАПАД
СНЕЖАНЬ

10
11
12






## ГІСТОРЫЯ

**Кастрычнік. Мінск**
**19–20.10**

Адкрытыя лекцыі польскіх спецыялістаў, прысвечаныя ахове гістарычных паркаў у супрацоўніцтве з ГА "Беларускі камітэт ІКАМОС"

**Кастрычнік. Мінск**
**28.10**

Прэзентацыя кнігі Дзмітрыя Матвейчыка "Паўстанне 1863-1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў" з серыі "Беларусь у войнах"

**Кастрычнік. Мінск**
**31.10**

Прэзентацыя чацвёртага нумара альманаха актуальнай літаратуры "Тэксты" выдавецтва "Галіяфы"

**Лістапад. Мінск**
**13.11**

"ДНІ ПОЛЬСКАЙ КУЛЬТУРЫ"

## МАСТАЦТВА

**Жнівень – Верасень. Мінск**
**27.08-14.09**

Выстава прац педагогаў кафедры фатаграфіі Мастацкага ўніверсітэта ў Познані "Бачнае – Невымоўнае"

**Кастрычнік. Мінск**
**21–22.10**

"МАСТАЦТВА І МЕСЦА"

Міжнародны семінар з удзелам вядомых польскіх куратараў і мастакоў – Анды Ротэнберг, Лявона Тарасэвіча і Прота Ярнушкевіча.

**Кастрычнік – Лістапад. Мінск**
**29.10–10.11**

"ДВА БАКІ СВЕТУ"

Выстава графікі Катажыны Гаўрых-Алендэр і малюнка Ежы Таліка

**Лістапад. Мінск**
**20–21.11**

Міжнародны круглы стол "Уладзіслаў Стрэмінскі: унізм у эстэтыцы і мастацтве"

**Лістапад – Снежань. Віцебск**
**02.12.13–19.01.14**

Выстава "PRINT/SCREEN/PRINT"

## МУЗЫКА

**Кастрычнік. Мінск**
**22.10**

"МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ. ЛІСТЫ ПРА МУЗЫКУ"

**Кастрычнік. Мінск**
**25.10**

Влодэк Паўлік "GRAND PIANO" фартэпіянныя імправізацыі

**Лістапад. Мінск**
**2-3.11**

"ФАТАГРАФІЧНЫЯ ПАРТЫТУРЫ"

**Лістапад. Мінск**
**06.11**

Канцэрт класічнай гітарнай музыкі
МАРЦІН КУЗЬНЯР (Польшча)

**Лістапад. Магілёў**
**19.11**

"VERBUM NOBILE "
Лірыка-камедыйная опера С.Манюшкі

**Лістапад. Мінск**
**23.11**

Канцэртная прэм'ера да 100-годдзя Вітольда Лютаслаўскага і 80-годдзя Хенрыка Мікалая Гурэцкага

**Лістапад. Мінск**
**28.11**

Канцэрт сімфанічнай музыкі

**Снежань. Быхаў, Беразіно**
**04–05.12**

"МУЗЫКА ПОЛЬСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ"

## МУЗЫКА

**Снежань. Полацк, Віцебск**
**08–09.12**
Канцэрт арганнай музыкі ў выкананні
МАРЭКА СТЭФАНЬСКАГА

**Лістапад. Мінск**
**13.12**

NOVIKA (Польшча)
Канцэрт электроннай музыкі

**Снежань. Мінск**
**16.12**

"ПА СТАРОНКАХ МУЗЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ"

## КІНО

**Кастрычнік – Лістапад. Мінск**

ПОЛЬСКІ КІНАКЛУБ

**16 кастрычніка**
АФОНЯ І ПЧОЛЫ
**23 кастрычніка**
РУЖАЧКА
**30 лістапада**
ХРЫШЧЭННЕ
**6 лістапада**
ПЛОШЧА ЗБАЎЦЫ
**13 лістапада**
ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

**Лістапад. Брэст**

ЯН ЯКУБ КОЛЬСКІ. РЭТРАСПЕКТЫВА ФІЛЬМАЎ

**14 лістапада**
ГІСТОРЫЯ КІНО Ў ПАПЕЛАВАХ
**15 лістапада**
ЯЗМІН
**16 лістапада**
ДАЛЕЙ АД ВАКНА
**17 лістапада**
ПАДГРАБЭК
**18 лістапада**
ЯКІ ГРАЕ З ТАЛЕРКІ
**19 лістапада**
ВЕНЕЦЫЯ

## КІНО

**Лістапад. Мінск**
**27.11**

ПОЛЬСКІ КІНАКЛУБ. АНТАЛОГІЯ ПОЛЬСКАЙ АНІМАЦЫІ

**"СОЛА НА АБЛОЗЕ"**
**"ЧОРНЫ КАПЯЛЮШ"**
**"ЛАГОДНАЯ"**
**"СПАБОРНІЦТВА"**
**"НАСТРОЙКА ІНСТРУМЕНТАЎ"**
**"САБОР"**
**"ICHTHYS"**

**Снежань. Мінск**

ПОЛЬСКІ КІНАКЛУБ. ПОЛЬСКАЯ ШКОЛА ДАКУМЕНТАЛЬНАГА КІНО. ВОЙЦЕХ ВІШНЕЎСКІ

**4 снежня**
"САРДЭЧНЫ ПРЫСТУП", "СЛЕД", "ЗАЎТРА: 31КРАСАВІКА – 1ТРАЎНЯ 1970", "ВІЛКАСЫ 70", "ГІСТОРЫЯ ПРА ЧАЛАВЕКА, ЯКІ ЗРАБІЎ 552% АД НОРМЫ"
**11 снежня**
"ВАНДА ГОСЦІМСКА. ТКАЧЫХА", "БУКВАР", "СТАЛЯР", "... МАЙСТАР ... НА ФЕРМЕ ...", "ГІСТОРЫЯ АДНАГО КАХАННЯ"

**Снежань. Мінск**
**18.12**

ПОЛЬСКІ КІНАКЛУБ. ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ФІЛЬМЫ РЭЖЫСЁРА А. СІКОРСКАГА З АРХІВА ІНСТЫТУТА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАМЯЦІ

**"ВЕРАСЕНЬ 1939 ГОДА Ў ЛЮБЛІНСКІМ РЭГІЁНЕ"**
**"ЛУПАШКА КАМАНДЗІР ХУБАЛЯ"**
**"ПАСЛЯ ПЕРШЫХ САВЕТАЎ"**
**"ВАЛЫНЬ У ПАЖАРЫШЧЫ"**

## ТЭАТР

**Кастрычнік. Мінск**

ПОЛЬСКІ ТЭАТР У РАМКАХ МІЖНАРОДНАГА ФОРУМА ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА "ТЭАРТ"
**7 кастрычніка**
Спектакль "(А)ПАЛОНІЯ" Новага Тэатра (Варшава)
**9-10 кастрычніка**
Спектакль "ПЕСНЯ ПРА МАЦІ І АЙЧЫНУ" Тэатра Польскага (Вроцлаў)

**Лістапад. Мінск**
**20.11**

ПОЛЬСКІ КІНАКЛУБ. ЗАЛАТАЯ СОТНЯ ТЭАТРА ПОЛЬСКАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ

ІВОНА, ПРЫНЦЭСА БУРГУНДСКАЯ

## ПОЛЬСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

**Кастрычнік – Снежань. Мінск, Гомель, Магілёў**

КУРСЫ ПОЛЬСКАЙ МОВЫ І КУЛЬТУРЫ

**Кастрычнік. Мінск, Баранавічы**

Месяц польскай літаратуры з кнігарняй "логвінаЎ"

**Лістапад. Баранавічы**
**13-14.11**

Удзел дырэктара бібліятэкі імя Лазарскага (Варшава) Генрыха Холендара у XIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Менеджмент бібліятэк устаноў вышэйшай адукацыі"

**Лістапад. Мінск**
**19.11**

Літаратурная імпрэза
"Karatkievič international"



“Мужакоўскі парк” www.fotopolska.eu

Кастрычнік. Мінск
## 19–20.10

### Адкрытыя лекцыі польскіх спецыялістаў, прысвечаныя ахове гістарычных паркаў у супрацоўніцтве з ГА “Беларускі камітэт ІКАМОС”

Мужакоўскі парк – знакаміты твор садова-паркавага мастацтва, занесены ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЭСКА. Вялізны ландшафтны парк, закладзены ў першай палове XIX ст., займае 700 га. Парк размяшчаецца на тэрыторыі Польшчы і Германіі і над яго аховай працуюць разам польскія і нямецкія спецыялісты.

**19 кастрычніка**
Лекцыя архітэктара, куратара праекта аховы Мужакоўскага парка Рэнаты Стаханчык. Пачатак у 18.45.

**20 кастрычніка**
Лекцыя дэндролага, прэзідэнта Міжнароднага таварыства аховы дрэваў Станіслава Стычынскага “Догляд і захаванне гістарычных дрэваў”. Пачатак у 10.30.

Музей Янкі Купалы
(вул. Янкі Купалы, 4).

Лістапад. Мінск
## 13.11

### “ДНІ ПОЛЬСКАЙ КУЛЬТУРЫ”

У рамках урачыстага адкрыцця “Дзён польскай культуры” ў Міханавічах наведвальнікі пазнаёмяцца з выставай кніг бібліятэкі Польскага Інстытута ў Мінску, яго дзейнасцю, а таксама прымуць удзел у прэзентацыі новай кнігі Дзмітрыя Матвейчыка “Паўстанне 1863-1864 гг. у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў”.

Мінская раённая цэнтральная бібліятэка (аграгарадок Міханавічы, вул. Школьная, 25).

Кастрычнік. Мінск
## 28.10

### Прэзентацыя кнігі Дзмітрыя Матвейчыка “Паўстанне 1863-1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў” з серыі “Беларусь у войнах”

Паўстанне з’явілася самай маштабнай ваеннай падзеяй на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX ст. За 150 гадоў выйшла шмат кніг, прысвечаных гэтай тэме, але цікавасць да яе не спіхае. Да імпрэзы падрыхтавана выстава “Гістарыяграфічны вобраз паўстання 1863-1864 гг.”. На ёй прадстаўлена каля 100 друкаваных і рукапісных дакументаў XIX-XXI стст. з фондаў бібліятэкі. Гэта апісанні ваенных дзеянняў, зборнікі справаводчых матэрыялаў і публіцыстыкі, мемуары, даследаванні айчынных і замежных навукоўцаў, якія асвятляюць тагачасныя падзеі з розных бакоў.

Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі (вул. Сурганава, 15, інфармацыйна-выставачны цэнтр, пакой 110).




Кастрычнік. Мінск
## 31.10

### Прэзентацыя чацвёртага нумара альманаха актуальнай літаратуры “Тэксты” выдавецтва “Галіяфы”




У беларускай культурнай прасторы альманах “Тэксты” заняў важнае месца, дзякуючы таму, што знаёміць чытача з якаснай літаратурнай крытыкай, новай беларускай прозай і паэзіяй, з адметнымі творамі замежных аўтараў.

Упрыгожыць прэзентацыю шоу барабанаў “Afrekete” (на базе школы этнічных барабанаў “Tekadum”), а таксама экзарцыстычны перформанс Gesamtkunstwerk (Ілля Сін, Павал Вайніцкі, Яўген Рагозін), Geotrupidae (My head is too big).

Галерэя “Ў”
(пр-т. Незалежнасці, 37А).
Пачатак а 19-й гадзіне.
Уваход вольны.

**Жнівень – Верасень. Мінск**

## 27.08–14.09

### Выстава прац педагогаў кафедры фатаграфіі Мастацкага ўніверсітэта ў Познані “Бачнае – Невымоўнае”

Выстава “Бачнае – Невымоўнае” з'яўляецца прэзентацыяй розных мастацкіх постацей педагогаў Кафедры фатаграфіі Мастацкага ўніверсітэта ў Познані. На выставе прадстаўлены працы Пятра Валыньскага, Славаміра Дэцыка, Анны Кэндзёры, Міхала Бугальскага, Магды Лазарчык, Ярослава Клюпся, Жакліны Пеханоўскай, а таксама дэкана факультэта мультымедыйнай камунікацыі Анджэя П. Флёркоўскага.

Музей сучаснага выяўленчага мастацтва, (пр. Незалежнасці, 47).

**Кастрычнік. Мінск**

## 21–22.10

### “МАСТАЦТВА І МЕСЦА”

Міжнародны семінар з удзелам вядомых польскіх куратараў і мастакоў – Анды Ротэнберг, Лявона Тарасэвіча і Прота Ярнушкевіча.

Анда Ротэнберг – польскі мастацтвазнаўца, у 1993- 2001 гг. – дырэктар Дзяржаўнай галерэі мастацтва “Zachęta” ў Варшаве, крытык, куратар выстаў і публіцыст.
Лявон Тарасэвіч – польскі мастак беларускага паходжання, прафесар Варшаўскай акадэміі мастацтваў.
Прот Ярнушкевіч – фатограф, намеснік дэкана факультэта мастацтва медыяў Варшаўскай акадэміі мастацтваў.

Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ – кафедра мастацтваў (Мінск, вул. Маякоўскага, 96).









Томаш Галецкі. З серыі "Green Screen"

Кастрычнік – Лістапад. Мінск

## 29.10–10.11

### “ДВА БАКІ СВЕТУ”

Выстава графікі Катажыны Гаўрых-Алендэр
і малюнка Ежы Таліка

Выстава складаецца з дзвюх частак.
Першая – аўтарскі праект Катажыны Гаўрых-Алендэр – успаміны і разважанні пасля побыту ў Мексіцы ў 2009 годзе. У працах яна выкарыстала сваю тэхніку – лічбавы друк на кавалачках метала. Другая частка выставы – графічныя лісты Ежы Таліка, выкананыя тушшу, з цыкла “Малюнкі з маей шуфляды”.

Музей сучаснага выяўленчага мастацтва,
(пр. Незалежнасці, 47).









К. Гаўрых-Алендэр. Плакат да выставы

Лістапад. Мінск

## 20–21.11

### Міжнародны круглы стол “Уладзіслаў Стрэміньскі: унізм у эстэтыцы і мастацтве”

Праект прысвечаны выбітнай асобе ў сучасным матацтве – Уладзіславу Стрэміньскаму, які нарадзіўся ў Мінску, але рэалізаваўся як мастак і тэарэтык мастацтва ў Польшчы і Расіі, пры гэтым ён абумовіў многія напрамкі ў тэорыі візуальнага пазнання, а таксама мастацтве авангарду. Мерапрыемства прысвечана 120- годдзю з дня нараджэння Ўладзіслава Стрэміньскага.

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі – Інстытут філасофіі (вул.Сурганава 1 к. 2).



Снежань – Студзень. Віцебск

## 02.12.2013–19.01.14

### Выстава “PRINT/SCREEN/PRINT”

На выставе будуць прадстаўлены дасягненні дзвюх найбольш вядомых польскіх майстэрняў, якія займаюцца шоўкаграфіяй: майстэрня шоўкаграфіі Акадэміі мастацтваў у г. Катавіцэ і майстэрня лічбавай адукацыі Акадэміі мастацтваў у Кракаве. Абодвума асяродкамі кіруе выдатны мастак – прафесар Вальдэмар Вэнгжын, які і будзе госцем вернісажу выставы ў Віцебску.

Віцебскі абласны краязнаўчы музей (вул.Леніна, 36).







Паўліна Вальчак. Гульні І. Шаўкаграфія



“ДЖАЗАВЫЯ ВЕЧАРЫ Ў ФІЛАРМОНІІ”

Кастрычнік. Мінск
**25.10**

# WŁODEK PAWLIK
Влодэк Паўлік

# GRAND PIANO
фартэпіянныя імправізацыі

...альбом ”Grand Piano” проста ВЯЛІКІ. Гэта проста адзін шэраг сольных імправізацый, паток свядомасці, запісы вандровак, без назвы, без накірункаў. Проста чыстая, прыгожая музыка... Ужывую яна ўспрымаецца яшчэ лепш... Паўлік грае, як быццам дыхае... У яго ігры можна пачуць цені і Шыманоўскага, і дэ Фаллі, і Пракоф'ева, і блюз, і танга...і таксама Шапэна... Ці гэта яшчэ джаз, ці класічная музыка ці нешта іншае... выказаць немагчыма.
Дарота Шварцман, часопіс “Polityka”

**www.wlodekpawlik.com**

Вялікая зала Беларускай дзяржаўнай філармоніі,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 50.



Кастрычнік. Мінск
**22.10**

## “МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ. ЛІСТЫ ПРА МУЗЫКУ”

Канцэрт з цыкла “Музыка Літвы і Кароны” ў рамках XXXIX Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Беларуская музычная восень”.

Выканаўцы:
ансамбль салістаў “Класік-Авангард”.
Мастацкі кіраўнік – заслужаны дзеяч мастацтваў РБ Уладзімір Байдаў.
Салісты:
Эдвард Сыцянкі (флейта, Польшча),
Ірына Лой (сапрана, Беларусь).
Вядучая – Святлена Немагай.
У праграме канцэрта прагучаць творы В.А.Моцарта, Й. Гайдна, М.К. Агінскага, Ф.Шапэна, С. Манюшкі.

Мінск, Камерная зала імя Р. Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі, пр. Незалежнасці 50

Цыкл “ФАТАГРАФІЧНЫЯ ПАРТЫТУРЫ”

Ministry of Culture and National Heritage of the Republic of Poland
ISCM POLISH SECTION POLSKIE TOWARZYSTWO MUZYKI WSPÓŁCZESNEJ
CITY OF WARSAW
ZAiKS

Дафінансавана са сродкаў Міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча.
Праект дадаткова фінансаваны Горадам Варшава.

## Лістапад. Мінск

Музыка часта з'ўляецца натхненнем для стварэння мастацкіх твораў. Цяпер мы маем адваротную сітуацыю. Цыкл фотаздымкаў з'яўляецца падставай для стварэння музычнага твора.
Гэтыя фотаздымкі ўспрымаюцца музыкантамі як сучасная музычная партытура...”

*Рышард Латэцкі*

**02.11**

## “СОН ПРА ПАДЛЯШША”

Марыюш Відэрыньскі – фатаграфія.
Мульціінструментальны калектыў LATERNA: Рышард Латэцкі, Мечыслаў Літвіньскі, Барт Палыга.
“Сон пра Падляшша вынікае з майго асабістага захаплення гэтым вельмі блізкім мне рэгіёнам. Цяжка быць абыякавым да цудоўнай прыгажосці Падляшша – краявіды, пушчы, шырокія лугі і балоты. Яго векавыя дружалюбныя шматкультурныя традыцыі, духоўнасць, неверагодная цеплыня і добразычлівасць мясцовых жыхароў. І ў рэшце рэшт той факт, што гэта мае родныя мясціны. А можа таксама крыху з нязрдзейсненых мараў...”

*Марыюш Відэрыньскі*

**03.11**

## “КАМЯНІ ЗАБЫЦЦЯ”

Марыюш Відэрыньскі – фатаграфія.
Ежы Карновіч – фартэпіяна.
Салісты ансамбля салістаў “Класік-Авангард” (мастацкі кіраўнік і дырыжор – У. Байдаў).
Ілона Лесь – віяланчэль.
Сяргей Махаў – флейта.
Вераніка Прадзед – цымбалы.

“Падставай праекта стала падарожжа па “ўсходнім муры" краіны, а менавіта па ўсходняй частцы Расточча. Падчас гэтай і наступных паездак я сустрэў у растачанскіх лясах забытыя, зарослыя кустамі і дрэвамі старыя грэка-каталіцкія могілкі з прыгожымі брусненскімі крыжамі і скульптурамі (каменеапрацоўчы асяродак у Старым Брусне славіўся па ўсёй паўднёвай Польшчы). Праз гады гэтыя ананімныя могільнікавыя сімвалы, якія жывуць сваім уласным жыццём, сталі яшчэ адной вобласцю маіх інтарэсаў. Першыя з іх былі ўсходняга абраду, пазней – габрэйскія, каталіцкія, мусульманскія, пратэстанцкія. Незалежна ад веравызнання і культуры, незалежна ад таго, каго яны ўвекавечылі, надыходзіць час, калі яны выклікаюць успаміны, натхняюць, вызваляюць фантазіі.”

*Марыюш Відэрынскі*

Камерная зала імя Р. Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі, пр. Незалежнасці, 50.







Марцін Кузьняр. Фота Э. Драбэк

Лістапад. Мінск
## 06.11

### Канцэрт класічнай гітарнай музыкі
### МАРЦІН КУЗЬНЯР (Польшча)

Марцін Кузьняр – лаўрэат польскіх і міжнародных гітарных конкурсаў, між іншым лаўрэат Гран-Пры IV Міжнароднага конкурса гітары ў Ольштыне (Польшча, 2009), I месца на 16. Міжнародным музычным конкурсе (Барлета, Італія, 2006), I месца на 12. Міжнародным моладзевым конкурсе FORUM GITARRE (Вена, 2009), I месца на 8. і на 10. Міжнародным фестывалі гітарнага мастацтва (Белград, 2007 і 2009), II месца на Міжнародным гітарным конкурсе “Джон Дуартэ” (г. Руст, Аўстрыя, 2012) і шмат іншых узнагарод. Марцін Кузьняр з поспехам канцэртаваў у Аўстрыі, Сербіі, Германіі, у Кракаўскай, Ольштынскай, Падкарпацкай філармоніях, Каралеўскім Замку і Каралеўскіх Лазенках у Варшаве, у Сенатарскай Зале на Вавелі (Кракаў), саляных капальнях у Вялічцы. За музычныя дасягненні М. Кузьняр стаў стыпендыятам Міністра Культуры і Нацыянальнай Спадчыны РП “Маладая Польшча 2010”, стыпендыяльнай праграмы “Sapere Auso” Малапольскага ваяводства і Фонда “Pro Musica Bona”.
У праграме: І.С. Бах, М. Пансе, Р.Р. Бенет, І. Альбеніс, Т. Кэры, Х. Радрыга.

Камерная зала імя Р. Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі,
пр. Незалежнасці, 50.

Лістапад. Магілёў
## 19.11

### “VERBUM NOBILE “
### Лірыка-камедыйная опера С.Манюшкі



Музычны Дом “Класіка” ў межах Камернага музычнага тэатра „Галерэя” прадстаўляе прэм՚еру лірыка-камедыйнай оперы знакамітага кампазітара С. Манюшкі “Verbum Nobile” (“Слова гонару”).
Прэм՚ера спектакля адбылася 30 мая 2013 г. у Мінску і атрымала вельмі пазітыўныя водгукі з боку гледачоў і тэатральных крытыкаў. Сюжэт лірычна-камедыйнай оперы “Verbum Nobile” грунтуецца на актуальнай стагоддзямі тэме кахання.
Выканаўцы вядучых партый: Галіна Дубіцкая, Арцём Хамічонак, Сяргей Кілеса, Валерый Маісеенка, Дзмітрый Капілаў.
Дырыжор-пастаноўшчык – Іван Касцяхін.
Рэжысёр-пастаноўшчык – Алена Медзякова.
Хормайстар – Жанна Філіповіч.

Магілёўскі драматычны тэатр, вул. Першамайская, 7.







Лістапад. Мінск
## 23.11

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь,
Мінскі абласны выканаўчы камітэт,
Беларуская дзяржаўная філармонія,
Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі,
Асацыяцыя маладых беларускіх кампазітараў



### Канцэртная прэм՚ера да 100-годдзя Вітольда Лютаслаўскага і 80-годдзя Хенрыка Мікалая Гурэцкага

Выканаўцы:
**Музычная капэла “САНОРУС"**, галоўны дырыжор – лаўрэат міжнародных конкурсаў Аляксандр Хумала,
**Сімфанічны аркестр Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі**, мастацкі кіраўнік і дырыжор - народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў,
**ЮСТЫНА САМБОРСКА** (сапрана, Польшча),
**ЮРЫЙ БЛІНОЎ** (фартэпіяна, Беларусь),
Мастацкі кіраўнік музычнага праекта і дырыжор - **АЛЯКСАНДР ХУМАЛА**.

У праграме канцэрта - прэм՚ерныя выкананні ў Беларусі сусветна вядомых твораў:
**I аддзяленне**
В. Лютаслаўскі. “Ланцуг №1”
В. Лютаслаўскі. Варыяцыі на тэму Паганіні для фартэпіяна і аркестра
**II аддзяленне**
Х.М. Гурэцкі. “Сімфонія журботных песнапенняў”

Вялікая зала Беларускай дзяржаўнай філармоніі,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 50.



Раман Перуцкі. Фота К. Гершэўскі

### Лістапад. Мінск
## 28.11

### Канцэрт сімфанічнай музыкі

Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор – народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў).
Заслужаны калектыў Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Рэспублікі Беларусь імя Р. Шырмы (Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор – народная артыстка Беларусі Людміла Яфімава).
Дырыжор – Вячаслаў Бартноўскі.
Саліст – Раман Пяруцкі (арган, Польшча).
У праграме: Ф. Пуленк. Канцэрт для аргана , струннага аркестра і літаўраў, М. Равель. Другая сюіта з балета "Дафніс і Хлоя", П. Чайкоўскі. Уверцюра - фантазія "Рамэа і Джульета", сюіта з балета "Спячая прыгажуня"

Вялікая зала Беларускай дзяржаўнай філармоніі, пр. Незалежнасці, 50.

### Снежань. Быхаў, Беразіно
## 04–05.12

### "МУЗЫКА ПОЛЬСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ"

Канцэрты ў выкананні беларускіх музыкантаў, лаўрэатаў міжнародных конкурсаў.

Дзіцячыя музычныя школы ў Быхаве і Беразіно.

### Снежань. Полацк
## 08.12

### Канцэрт арганнай музыкі ў выкананні МАРЭКА СТЭФАНЬСКАГА

У рамках XVIII Міжнароднага фестывалю арганнай музыкі "Званы Сафіі".

Канцэртная зала Свята-Сафійскага кафедральнага сабора ў Полацку, вул. Замкавая, 1.

### Снежань. Віцебск
## 09.12

### Канцэрт арганнай музыкі ў выкананні МАРЭКА СТЭФАНЬСКАГА

Віцебская абласная філармонія, Віцебск, пл. Леніна, 69.



Марэк Стэфаньскі – вядомы польскі арганіст, пераможца шматлікіх міжнародных конкурсаў арганнай музыкі, у тым ліку – лаўрэат I узнагароды ў рамках European Forum d'Art Sacre. З 1996 па 2007 гг. займаў пасаду арганіста Кракаўскага Марыяцкага Касцёла, з якім працягвае супрацоўнічаць і ў цяперашні час. Выступаў з канцэртамі ў большасці краін Еўропы, Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі, Ізраілі і Расіі. З'яўляецца заснавальнікам і мастацкім дырэктарам Музычнага фестывалю "Вечары арганнай і камернай музыкі ў Касцёлах Жэшава", а таксама "Арганных канцэртаў у Ярасласкім абацтве".

У канцэртах можна пачуць старадаўнюю польскую музыку, І.С. Баха, І.Л. Крэбса, М. Сужыньскага, Г.А. Меркеля.



### Снежань. Мінск
## 13.12

### NOVIKA (Польшча)
### Канцэрт электроннай музыкі

NOVIKA (Катажына Новіцка) – вядомая постаць польскай клубнай сцэны – спявачка, аўтар музыкі і тэкстаў, рэдактар на радыё.
Тры альбомы NOVIKI (Tricks of Life, 2006; Lovefinder, 2011; Mixfinder, 2012) атрымалі тытул "Альбом года – клубная і электронная музыка".

"Loft Cafe", вул. П. Броўкі, 22



Novika. Фота Я. Порэмба

### Снежань. Мінск
## 16.12

### "ПА СТАРОНКАХ МУЗЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ"

Творчы вечар настаўнікаў і навучэнцаў дзяржаўнай установы адукацыі "Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 3 імя Ф. Шапэна г. Мінска"

У праграме прагучаць творы Ф. Шапэна, Н. Орды, В. Длугарая, М. К. Агінскага, С. Манюшкі, беларускіх аўтараў.

Канцэртная зала "Верхні горад" (пл. Свабоды, 23А).
Пачатак у 18.30.



## ПОЛЬСКІ КІНАКЛУБ

**Кастрычнік – Лістапад. Мінск**

### 16.10
### АФОНЯ І ПЧОЛЫ
2008 г.,108 хв., каляр.

Рэжысёр: Ян Якуб Кольскі.
У ролях: Андрэй Біланаў, Марыюш Санітэрнік, Гражына Бленцка-Кольска, Зоф'я Зонь.
1953 год. Афоня жыве недзе ў глушы з мужам - у мінулым чэмпіёнам па барацьбе, а цяпер інвалідам. Адзіная радасць гэтай жанчыны - старая кінакамера, на якую яна здымае ўсё, што яе акружае. Але вось аднойчы мернае існаванне герояў парушае з'яўленне загадкавага рускага...

### 23.10
### РУЖАЧКА
2010 г.,110 хв., каляр.

Рэжысёр: Ян Кідава-Блоньскі.
У ролях: Магдалена Бачарска, Роберт Вянцкевіч, Анджэй Севярын, Ян Фрыч.
Варшава, 1967 год. У маладой і прывабнай Камілы Саковіч бліскія адносіны з Раманам Рожэкам. Іх звязвае сапраўдная страсць, але дзяўчына не ведае, што Раман - супрацоўнік Службы бяспекі Польшчы. Калі ў краіне разгортваецца антысеміцкая кампанія, ён просіць Камілу аб ласцы: ёй трэба зблізіцца з вядомым пісьменнікам, Адамам Варчэўскім, і даведацца, ці не з'яўляецца ён таемным сіяністам.

### 30.10
### ХРЫШЧЭННЕ
2010 г., 85 хв., каляр.

Рэжысёр: Марцін Врона.
У ролях: Войцех Зяліньскі, Наталля Рыбіцка, Адам Варановіч, Міхал Катэрскі.
Міхал уцёк з правінцыйнага Тарнова да Варшавы. У вялікім горадзе, з прыгожай жонкай Магдай і нованароджаным сынам праводзіць, здавалася б, дасканалае жыццё. Ідылію парушае з'яўленне Янкі - старога сябра, які ў хуткім часе будзе хросным бацькам іх дзіцяці.

### 06.11
### ПЛОШЧА ЗБАЎЦЫ
2010 г., 105 хв., каляр.

Рэжысёры: Ёанна Кось-Краўзэ, Кшыштаф Краўзэ.
У ролях: Ёвіта Мёндлікоўска, Аркадыюш Янічэк, Ёанна Кось, Эва Вэнцэль.
У кватэры на варшаўскай плошчы Збаўцы жыве сям'я: муж з жонкаю, два сыны ды мужава мама.
Іх штодзённасць поўная ўзаемных прэтэнзій, асабістых расчараванняў, што з часам спараджае жорсткасць, варожасць, здзекі. Маладая сям'я будавала кватэру, аднак кампанія-забудоўнік збанкрутавала, і сын з жонкаю ды дзецьмі пераязджаюць жыць да маці. Тая варожа ставіцца да нявесткі, а муж не звяртае ўвагі на жончыны праблемы. Даведзеная да адчаю цяжкасцямі лёсу, здзекамі свекрыві ды здрадаю мужа, маладая жанчына спрабуе атруціць сябе і дзяцей. Фільм зняты паводле рэальных падзеяў.

### 13.11
### ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ
2010 г., 126 хв., каляр.

Рэжысёр: Кася Адамік.
У ролях: Марцін Дарачыньскі, Эрык Любаш, Дзмітрый Персін, Марэк Каліта.
Бяздомны саракагадовы Яцэк Мруз - былы нападаючы польскай зборнай. Яцэк збірае каманду са сваіх "бяздомных калегаў". Іх мара - сыграць на Міжнародным Чэмпіянаце па футболе сярод бяздомных.

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, корпус 2, вул. Сурганава 14, А, аўд. 310. (ст. м. "Акадэмія навук").
Пачатак а 19-й гадзіне.
Фільмы дэманструюцца на мове арыгінала.
Уваход вольны.

## ЯН ЯКУБ КОЛЬСКІ. РЭТРАСПЕКТЫВА ФІЛЬМАЎ

**Лістапад. Брэст**

Ян Якуб Кольскі - адзін з найбольш вядомых сучасных польскіх рэжысёраў аўтарскага кіно. У якасці рэжысёра ці аператара зняў больш за 30 стужак. Выкладае ў школе кінарэжысуры Анджэя Вайды.
У фільмах Кольскага сучаснае пераплятаецца з мінулым, рэалізм з чарадзействам, хрысціянства з паганствам. Фільмы рэжысёра шматразова былі ўзнагароджаны на польскіх і міжнародных фестывалях.



### 14.11
### ГІСТОРЫЯ КІНО Ў ПАПЕЛАВАХ
фэнтэзі, меладрама. Польшча, 1998 г., каляр., 100 хв.

У ролях: Кшыштаф Майхшак, Барташ Апаня, Гражына Бленцка-Кольска, Францішак Печка.

Гісторыя роду кавалёў Андрышэкаў, што пачынаецца ад Андрышэка I, які стварыў у XIX стагоддзі кінамашыну, і працягваецца ў 60-х гадах XX стагоддзя з Андрышэкам VI, якога завуць Шустэк – хлопчык, які марыць аднавіць вынаходку, што загінула ў часе пажару.

Узнагароды: 1999 - Узнагарода Польскай Кінаакадэміі "Арол" за лепшы польскі фільм 1998 г.,
1999 - Узнагарода "Срэбны Віцязь" на МКФ праваслаўнага кіно "Залаты Віцязь" у Маскве,
1999 – Гран-пры МКФ у Трыесце,
1999 – Гран-пры МКФ у Жэневе.

### 15.11
### ЯЗМІН
Меладрама, Польшча, 2006 г., каляр., 103 хв.

У ролях: Гражына Бленцка-Кольска, Януш Гаёс, Адам Фэрэнц.

У мужчынскім манастыры адбываецца нешта дзіўнае: тры манахі пачынаюць духмяна пахнуць. Згодна са старажытным прадказаннем, ігумен чакае новых цудаў. Тым часам для рэстаўрацыі ікон сюды прыбывае мастачка, якая жадае аднавіць цудоўны пах манахаў.

Узнагароды: 2006 – Спецыяльная ўзнагарода ФПМФ у Гдыні для Яна Якуба Кольскага,
2007 – Узнагарода Польскай Кінаакадэміі „Арол" за лепшую мужчынскую ролю для Януша Гаёса, за лепшую музыку для Зыгмунта Канечнага і прыз глядацкіх сімпатый для Яна Якуба Кольскага.

### 16.11
### ДАЛЕЙ АД ВАКНА
Драматычны фільм, Польшча, 2000 г., каляр., 104 хв.

У ролях: Дамініка Асталоўска, Барташ Апаня, Дарота Ляндоўска, Караліна Грушка.

Падчас акупацыі Ян і Барбара хаваюць габрэйскую дзяўчыну Рэгіну. Заўважыўшы, што Рэгіна цяжарная, абражаная жонка мае намер выдаць яе, але ёй да галавы прыходзіць план. Барбара імітуе цяжарнасць, а пасля нараджэння дзіцяці прысвойвае сабе ролю маці.

Узнагароды: 2001 – Гран-пры на ФПМФ у Гдыні, 2001 – Намінацыя на ўзнагароду "Святы Георгій" за лепшы замежны фільм на МКФ у Маскве.

### 17.11
### ПАДГРАБЭК
Меладрама, Польшча, 1993 г., каляр., 75 хв.

У ролях: Францішак Печка, Марыюш Санітэрнік, Кшыштаф Пячыньскі, Гражына Бленцка-Кольска.

Фільм апавядае пра подзвігі, на якія здольны закаханы дзеля выдатнага пачуцця, якое імі авалодала.

Узнагароды: 1993 - Узнагарода Ўсходнееўрапейскага сцэнарнага фонду.

### 18.11
### ЯКІ ГРАЕ З ТАЛЕРКІ
Фэнтэзі, меладрама, Польшча, 1995 г., каляр., 107 хв.

У ролях: Францішак Печка, Марыюш Санітэрнік, Гражына Бленцка-Кольска.

Скрыпач Люнда – чалавек, які грае з абломкаў талерак. Намаляваныя на іх узоры ён чытае як ноты і грае па іх музыку. Ён хоча заграць з цэлай талеркі круглы шляк, але вельмі баіцца свайго жадання.

Узнагароды: 1995 – Узнагарода на МКФ у Токіа.

### 19.11
### ВЕНЕЦЫЯ
Драматычны фільм, Польшча, 2010 г., каляр., 110 хв.

У ролях: Марцін Валеўскі, Магдалена Цялецка, Агнешка Грахоўска, Гражына Бленцка-Кольска.

Марэк закаханы ў Венецыю і ведае назвы ўсіх плошчаў і храмаў горада. Яго сям'я збіраецца ў Венецыю, але надыходзіць восень 1939 года, і хлопчыка адпраўляюць за горад да цёткі Веранікі.

Кінатэатр "Беларусь", вул. Савецкая, 62

## ПОЛЬСКІ КІНАКЛУБ

Лістапад. Мінск
**27.11**

### АНТАЛОГІЯ ПОЛЬСКАЙ АНІМАЦЫІ

Прэзентацыя польскіх анімацыйных фільмаў для дарослых.
Праграма ўключае фільмы польскай анімацыі, у якіх закранаюцца разнастайныя тэмы і праблемы.

**“СОЛА НА АБЛОЗЕ”**
Рэж. Ежы Каліна,
**“ЧОРНЫ КАПЯЛЮШ”**
Рэж. Пётр Думаля,
**“ЛАГОДНАЯ”**
Рэж. Пётр Думаля,
**“СПАБОРНІЦТВА”**
Рэж. Марэк Серафіньскі,
**“НАСТРОЙКА ІНСТРУМЕНТАЎ”**
Рэж. Ежы Куця,
**“САБОР”**
Рэж. Томаш Багіньскі,
**“ICHTHYS”**
Рэж. М. Скрабецкі.

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, корпус 2, вул. Сурганава, 14 А, аўд. 310. (ст. м. “Акадэмія навук”).
Пачатак а 19-й гадзіне.
Фільмы дэманструюцца на мове арыгінала.
Уваход вольны.

### ПОЛЬСКАЯ ШКОЛА ДАКУМЕНТАЛЬНАГА КІНО. ВОЙЦЕХ ВІШНЕЎСКІ

Снежань. Мінск
**04.12**

**“САРДЭЧНЫ ПРЫСТУП”, “СЛЕД”, “ЗАЎТРА: 31КРАСАВІКА – 1ТРАЎНЯ 1970”, “ВІЛКАСЫ 70”, “ГІСТОРЫЯ ПРА ЧАЛАВЕКА, ЯКІ ЗРАБІЎ 552% АД НОРМЫ”**

Снежань. Мінск
**11.12**

**“ВАНДА ГОСЦІМСКА. ТКАЧЫХА”, “БУКВАР”, “СТАЛЯР”, “... МАЙСТАР ... НА ФЕРМЕ ...”, “ГІСТОРЫЯ АДНАГО КАХАННЯ”**

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, корпус 2, вул. Сурганава, 14 А, аўд. 310. (ст. м. “Акадэмія навук”).
Пачатак а 19-й гадзіне.
Фільмы дэманструюцца на мове арыгінала.
Уваход вольны.

## ПОЛЬСКІ КІНАКЛУБ

Снежань. Мінск
**18.12**

### ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ФІЛЬМЫ РЭЖЫСЁРА А. СІКОРСКАГА З АРХІВА ІНСТЫТУТА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАМЯЦІ

**“ВЕРАСЕНЬ 1939 ГОДА Ў ЛЮБЛІНСКІМ РЭГІЁНЕ”**
Дак. фільм, 2007 г., каляр., 23 хв.
**“ЛУПАШКА КАМАНДЗІР ХУБАЛЯ”**
Дак. фільм, 2007 г., каляр., 25 хв.
**“ПАСЛЯ ПЕРШЫХ САВЕТАЎ”**
Дак. фільм, 2007 г., каляр., 20 хв.
**“ВАЛЫНЬ Ў ПАЖАРЫШЧЫ”**
Дак. фільм, 2007 г., каляр., 23 хв.

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, корпус 2, вул. Сурганава, 14 А, аўд. 310. (ст. м. “Акадэмія навук”).
Пачатак а 19-й гадзіне.
Фільмы дэманструюцца на мове арыгінала.
Уваход вольны.

## ПОЛЬСКІ ТЭАТР У РАМКАХ МІЖНАРОДНАГА ФОРУМА ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА “ТЭАРТ”

Кастрычнік. Мінск
**07.11**

### Спектакль “(А)ПАЛОНІЯ” Новага Тэатра (Варшава)

Рэжысёр Кшыштаф Варлікоўскі
У ролях: Анджэй Хыра, Магдалена Цялецка, Эва Далкоўская, Малгажата Хаеўска-Кшыштофік, Войцэх Калярус, Марэк Каліта, Зыгмунт Маляновіч, Адам Навойчык, Мая Асташэўская, Магдалена Паплаўска, Яцэк Панядзялэк, Ганна Радван-Ганцарчык, Моніка Немчык, Мацей Штур, Томаш Тындзік.
“(А)палонія” – гэта спроба вызначыць межы чалавечнасці. Гэта даследаванне страху і роспачы вайны, пасляваеннага гора. Але ў спектаклі няма адмоўных персанажаў. Тут не ставіцца пытанне пра дабро і сэнс самаахвярнасці трох гераінь. Варлікоўскі заўсёды вывучае медаль з абодвух бакоў. У ахвярнасці ён шукае скрытыя крупінкі эгаізму, дэпрэсіі, недахопу ўяўлення, уцёкаў ад жыцця. Іфігенія, Алкеста і Апалонія гэтак жа бездапаможныя ў святле таго, што адбываецца, як і тыя, дзеля каго яны здзяйсняюць сваю ахвяру. Даволі цяжка ўявіць сабе гэтых жанчын у ролі нявінных ахвяр калектыўнай нянавісці. Яны рацыянальна ўсведамляюць наступствы свайго ўчынку, нягледзячы на тое, што ім даводзіцца прымаць рашэнні, якія апынуліся непасільнымі для іх блізкіх.

Пляцоўка спартыўнага комплекса “Дынама” (вул. Даўмана 23).
Пачатак а 19-й гадзіне

Кастрычнік. Мінск
**09–10.11**

### Спектакль “ПЕСНЯ ПРА МАЦІ І АЙЧЫНУ” Тэатра Польскага (Вроцлаў)

Рэжысёр: Ян Клята.
У ролях: Ганна Ільчук, Паўліна Хапко, Дамініка Фігурска, Кінга Прайс, Халіна Расякувна, Войцех Зямяньскі.
Інсцэніроўка кнігі вядомага філолага і феміністкі Бажэны Кеф, якая вылучалася на літаратурную прэмію “Nike” ў 2009 годзе. Гэта твор пра ідэальнае і рэальнае, ідэальную маці і дачку і іх рэальныя адносіны, пра затоеную жорсткасць тых, хто стаў ахвярай Халакоста і выжыў, і, нарэшце, пра ідэал, які выходзіць за рамкі звычайнага разумення дзяржавы, – ідэальную Айчыну, якая, як нас вучыць нацыяналізм XIX стагоддзя, складаецца з крыві і зямлі. Гэта твор не пра лёс мужчыны ці жанчыны, тых, хто выжыў падчас габрэйскага генацыду, а пра жыццё іх дарослага дзіцяці.
Жанр гэтага спектакля вызначыць вельмі складана. На сцэне рэжысёру ўдалося злучыць найвялікшыя тэксты мінулага, біблейскія матывы і стылістыку старажытнагрэцкіх трагедый з сучаснымі творамі, уключаючы Лару Крофт і фільмы Рыдлі Скота.

Палац культуры МАЗ (пр. Партызанскі, 117а).
Пачатак а 19-й гадзіне.

## ПОЛЬСКІ КІНАКЛУБ

Лістапад. Мінск
**20.11**

### ЗАЛАТАЯ СОТНЯ ТЭАТРА ПОЛЬСКАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ

**ІВОНА, ПРЫНЦЭСА БУРГУНДСКАЯ**
1987 г., каляр., тэлевізійны спектакль, 112 хв.

Аўтар: Вітальд Гамбровіч.
Рэжысёр: Зыгмунт Хубнэрт.
Відовішча адбываецца ў фантастычным каралеўстве, жыццё ў якім, на жаль, падпарадкавана звычайным законам чалавечага існавання. Тут пануюць здрада, крыўда, зайздрасць, тут кожны вымушаны насіць маску і хаваць у шафе шкілеты. Што здарыцца, калі ў гэтыя абставіны выпадкова трапіць шчырасць і каханне?..

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, корпус 2, вул. Сурганава, 14 А, аўд. 310. (ст. м. “Акадэмія навук”).
Пачатак а 19-й гадзіне.
Фільмы дэманструюцца на мове арыгінала.
Уваход вольны.

**Кастрычнік. Мінск.**

У цэнтры Мінску ў кнігарні “логвінаЎ” на сталай аснове адкрываецца “Польская шафа” – вялікая паліца з польскімі кнігамі на польскай і беларускай мовах. Сучасныя і класічныя, дарослыя і дзіцячыя, дэтэктывы і фантастыка, – падыходзь і набывай, ці проста чытай. Акрамя гэтага, цэлы кастрычнік раз на тыдзень на розных культурных пляцоўках Мінску будуць адбывацца літаратурныя, музычныя і тэатральныя імпрэзы, з удзелам паэтаў, спевакоў і актораў з Польшчы і Беларусі.

# МЕСЯЦ ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ
## з кнігарняй “логвінаЎ”

**1 кастрычніка**

Пасля ўрачыстага адкрыцця “Польскай шафы”, на якім выступяць ганаровыя госці, адбудзецца канцэрт Зміцера Вайцюшкевіча, прысвечаны творчасці польскага паэта Рафала Ваячака.

Кнігарня “логвінаЎ” і Галерэя “Ў”, пр. Незалежнасці, 37а.
Пачатак а 18-30. Уваход – вольны.

**8 кастрычніка**

Прэзентацыя кнігі аднаго з найяскравых сучасных паэтаў Польшчы Рышарда Крыніцкага “Дакрануцца” . З удзелам аўтара і перакладчыка Андрэя Хадановіча.

Кнігарня “логвінаЎ” і Галерэя “Ў”, пр. Незалежнасці, 37а.
Пачатак а 19-ай. Уваход – вольны.

**15 кастрычніка**

Кніжная выстава, прысвечаная жыццю і творчасці Юльяна Тувіма. З удзелам даследчыкаў творчасці Ю. Тувіма, літаратуразнаўцаў, перакладчыкаў.

Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі, вул. Сурганава, 15, чытальная зала рэдкіх кніг і рукапісаў, пакой 601.
Пачатак а 16-ай. Уваход – вольны.

**22 кастрычніка**

Тэатралізаваная прэзентацыя перакладу камедыйных п'ес драматурга Аляксандра Фрэдры “Помста” і “Дзявочыя зарокі”. На прэзентацыі акторы Купалаўскага тэатру разыграюць некалькі ўрыўкаў з твораў драматурга. З удзелам перакладчыкаў Андрэя Хадановіча і Марыі Мартысевіч. Вядучы – Лявон Баршчэўскі.

Рэпетыцыйная сцэна Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Энгельса 7.
Пачатак а 18. Уваход – вольны.











**30 кастрычніка**

Прэзентацыя кнігі Марка Эдэльмана і Паўлы Савіцкай “У геце было і каханне ”. З удзелам рэдактаркі кнігі Інэсы Кур'ян, перакладчыкаў Веранікі Бандаровіч і Юрася Барысевіча, прадстаўніцы польскага габрэйскага музею Марты Янчэўскай, і аўтара ідыш-беларускага слоўніка Алеся Астравуха. Адкрыццё міні-фотавыставы “Боль. Шмоль.” мастачкі Дзіны Даніловіч. Музычнае аздабленне – ансамбль клейзмераўскай музыкі “Мінскер Капелье”.

Галерэя “Ў”, пр. Незалежнасці, 37а.
Пачатак а 19. Уваход – вольны.




**Кастрычнік – Снежань.**
**Мінск, Гомель, Магілёў**

КУРСЫ ПОЛЬСКАЙ МОВЫ І КУЛЬТУРЫ

Двухгадовы цыкл навучання польскай мове для моладзі і дарослых, знаёмства з польскай гісторыяй, літаратурай і культурай.

**Лістапад. Баранавічы.**
**13-14.11**

Удзел дырэктара бібліятэкі імя Лазарскага (Варшава) Генрыха Холендара (Henryk Hollender) у XIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Менеджмент бібліятэк установ вышэйшай адукацыі”. Мэтай канферэнцыі з'яўляецца павышэнне кваліфікацыі бібліятэкараў установ вышэйшай адукацыі,
абмен вопытам у галіне ўкаранення перадавых тэхналогій і форм інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання розных напрамкаў навуковай дзейнасці.

Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт.

**Лістапад. Мінск.**
**19.11**

Літаратурная імпрэза “Karatkievič international” у межах літаратурнага фестывалю “Лятучы стол Караткевіча”.
Прэзентацыя польскага перакладу рамана “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”
з удзелам перакладчыцы беларускай літаратуры Малгажаты Бухалік.
Вядучы – Андрэй Хадановіч.

Кнігарня “логвінаЎ”, пр. Незалежнасці, 37а.
Пачатак а 19-й.



ПАДРАБЯЗНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ
www.instpol.by

ПОЛЬСКІ ІНСТЫТУТ ЗАПРАШАЕ:
панядзелак – пятніца: 9.00 – 16.00
БІБЛІЯТЭКА І ВІДЭАТЭКА:
аўторак – 10.00 – 14.00,
пятніца – 12.00 – 16.00
вул. Валадарскага 6,
220030 Мінск, Беларусь
тэл.: (017) 200-95-81, 200-63-78,
тэл./факс: (017) 200-48-74
e-mail: minsk@instytutpolski.org

У праграме мерапрыемстваў могуць адбыцца змены, таму самую актуальную і вычарпальную інфармацыю пра дзейнасць Польскага Інстытута ў Мінску Вы можаце атрымаць на нашым сайце або па тэлефонах